# «Стежки как стёжки»

***Аднойчы ў аддзеле культуры райвыканкама мяне спыталі: "Вам прыхсдзілася калі-небудзь удзельнічаць у міжнародных праектах Мікіты Міхалкова?". Я наеат збянтэжылася: "Ну і пытанне! Дзе Слуцк, а дзе Масква! Параўналі. Маштабы ж розныя..." І вы са мной пагадзіцеся, паважаныя чытачы. Ці пад сілу звычайнаму чалавеку прабіцца на такі высокі форум! А калі нават і рызыкнуць - то з якімі такімі выдатнымі дасягненнямі туды з'явіцца?***

На гэта мне сказалі: "А вось жыхарка вёскі Гацук Зінаіда Паўлаўна Дубовік са сваімі вышыўкамі тройчы ўдзельнічала ў міжнародным конкурсе "'Філантроп". А ён, як вядома, праходзіць пад патранажам знакамітага рускага рэжысёра Міхалкова.

Я здзівілася. як гэта простай жанчыне пашанцавала. і паехала ў вёску - знаёміцца з творцай. Тым больш, што ад Слуцка да Гацука значна бліжэй, чым да славутых сталіц. Шлях да вёскі я пераадолела на аўтобусе за 40 хвілін. А вось узняцца да вяршынь духу мастачкі мне так і не ўдалося: не хапіла ні сіл. ні мужнасці. Зорка яе таленту, яе лёсу аказалася значна вышэй за ўсе форумы, разам узятыя.

Сёння ў галерэі мастацтваў працуе выстаўка яе твораў. І я зноў адкрываю для

сябе асобу сапраўднага майстра. Уважліва разглядаю ў экспазіцыі вышытыя партрэты вялікіх дзеячаў сусветнай культуры. Заўважаю, як па майстэрску падабраны ніткі; і гэта пры тым, што кожная выява чалавечага твару патрабуе да сотні адценняў колеру. Захапляюся прыгажосцю вышытых ікон, ручнікоў, сурвэтак. Як добрых знаёмых, пазнаю драўляныя скульптуры. На жаль, па-за межамі выстаўкі засталіся жывапісныя краявіды, а таксама вытанчаныя карункі, якія Зінаіда Паўлаўна пляце па-старажытнаму - "на коклюшках". А ёсць яшчэ і літаратурная спадчына: вершы, проза.

Гэта прыгожая, таленавітая жанчына - інвалід дзяцінства. Нарадзілася ў 1940 годзе ў вёсцы Белая Лужа. 3 пяці гадоў моцным ланцугом прыкавана яна да свайго болю ў пазваночніку, да немагчымасці з хуткасцю прысесці ці ўстаць, легчы, з лёгкасцю зрабіць крок. Вышывае Зінаіда Паўлаўна стоячы, пакуль не ацякуць ногі, ці лежачы. Сядзець не можа, пакутуе з-за сваёй хваробы.

Як пачыналася яе жыццё? Пасля заканчэння вайны, у пяць гадоў, яна абязножыла. У 1947 годзе трапіла ў спецыяльны дзіцячы санаторый у Еўпаторыі. Шэсць гадоў праляжала яна там - нерухомая, удалечыні ад роднага дому. Калі вярнулася ў вёску, то пачула: "Бачыш, цябе і ногі не трымаюць. Чым так пакутаваць, лепш бы ты памерла". Але Зінаіда Паўлаўна, праглынуўшы слёзы, з гэтым не пагадзілася. Прага жыцця, пачуццё чалавечай годнасці аказаліся мацней за ўсё.

Свой ўзлёт яна пачала з таго, што даравала тым людзям іх жорсткія словы, нават пашкадавала іх. Час тады быў пасляваенны, суровы. Хто застаўся жыць пасля вайны,усе ўздымалі разбураную гаспадарку, на ўліку былі кожныя рабочыя рукі, кожны "лішні" рот. Хто тады ўглядваўся ў душу маладзенькай, хворай Зінаіды?

А дзяўчына прыехала ў вёску з горкім, але багатым жыццёвым вопытам. Там, у Еўпаторыі, яна пазнала не толькі адзіноту і боль. Ёй былі падораны радасць дружбы, святло юнацкага даверу. У лячэбным санаторыі Зінаіда скончыла сямігодку

Цесныя сцены бальнічных палат расступаліся перад палётам узнёслых думак. У лік сваіх сябрбў і сваякоў яна назаўсёды залічыла Пушкіна, Льва Талстога, Гюго, Сервантэса, Рабіндраната Тагора, Янку Купалу, Якуба Коласа, шмат іншых пісьменнікаў і паэтаў - тых, хто не даў ёй трапіць у адчай, цемру несуцешнасці. Іх кнігі адкрывалі ёй жыццё, вучылі любві, мудрасці.

Цела дзяўчынкі было анямелым, але дзейнічалі рукі, бачылі вочы. У Еўпаторы) Зіна павучылася маляваць. вязаць, вышываць. Тыя першыя "стежки" сталі яе сцяжынкамі - у свет мастацтва, у свет творчасці.

Магутная воля да жыцця тварыла цуд. Зінаіда Паўлаўна, насуперак прыгавору ўрачоў, узнялася з ложка, з цяжкасцю, але стала на свае ногі, пачала паціху рухацца на мыліцах. У хуткім часе паехала ў Мінск да старэйшай сястры - працягваць вучобу ў сярэдняй школе. Усе разам яны туліліся ў адным пакойчыку, "на кватэры". Зінаіда ледзь дабіралася да школы, а потым - з хворым пазваночнікам, ахопленая болем, як полымем, сядзела за партай шэсць гадзін. Але вучылася вельмі добра.

Пасля заканчэння школы працавала спачатку ў шавецкай майстэрні, потым - на трыкатажнай фабрыцы. У 1962 годзе Зінаіда Паўлаўна паступіла ў Мінскае медыцынскае вучылішча, якое скончыла на "выдатна". Праз два гады пасля яго заканчэння. паступіла на завочнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута. Але давучыцца не змагла. Яна ўсё яшчэ "гаравала" па чужых людзях, працавала на паўтары стаўкі, каб сабраць грошы на куплю кватэры. Ні часу, ні здароўя на вучобу ўжо не заставалася. І ў рэшце рэшт яна набыла кватэру ў Мінску. Потым змяніла вялікі горад на маленькі, пераехала жыць у Салігорск.

Там працавала лабаранткай у рэнтген-кабінеце раённай бальніцы, была нязменным рэдактарам і мастаком насценных газет і стэндаў, займалася рукадзеллем.

У 45 гадоў Зінаіда Паўлаўна пайшла на пенсію. Яе працоўны стаж налічвае 25 гадоў. У тую пару яна пасялілася ў вёсцы Гацук. З ёю назаўсёды засталіся яе верныя паплечнікі - кнігі, музыка, выяўленчае і прыкладное мастацтва.

У дзень адкрыцця сваёй выстаўкі ў галерэі, Зінаіда Паўлаўна сказала: "Я не магла самастойна перайсці вуліцу, але вандравала па ўсяму зямному шару з героямі Жуль Верна, Дзюма, Сервантэса, Гюго. Яны ратуюць мяне і сёння, а вышываныя партрэты - толькі даніна маёй глыбокай ім удзячнасці".

У гэтай жанчыны, мастачкі - не толькі дастойна пражыгтыя гады. У яе - невычэрп-ная энергія, свежасць пачуццяў і набытае майстэрства. Наперадзе ў Зінаіды Паўлаўны - выстаўкі, конкурсы, фестывалі. Наперадзе ў яе - усё жыццё.

**Зинаида Дубовик**

* * *

Стежки, как стёжки, не кончаются.
В стежках моя жизнь проявляется.
А стёжками она измеряется.
В узоре моём сад распускается,
Когда ангел ко мне является.

* * *

Весна дорогу мне открывает,
Открывает силы земля.
Мою жизнь надежда питает,
Как питает землю вода.

Зима дорогу мою засыпает,
Засыпает под снегом земля.
Но надежда моя не тает,
Как не тают в мороз снега.

* * *

Счастье - и в прошлом,
и впереди.
Его стороною не обойди.
Счастью не надо распахивать дверь,
Ты только сердцем в него поверь!
Счастью душу надо открыть,
Словом прекрасным к себе заманить.

* * *

Я о счастье много слыхала.
С нетерпеньем его ожидала.
Иль оно, как солнце, за тучу зашло?
Или я его не узнала?

* * *

Я не могу ходить,
Но то, что у жизни взяла,
То, что я поняла,
Не хочу с собой уносить.

Л . Салодкіна

Слуцкі край. – 2006. – 11 лістап. – С. 4.